✓**13 кастрычніка** ў галерэі «Атрыум» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава **«Карункавая гісторыя»**, на якой прадстаўлены работы Генадзя і Святланы Вяляў. Разам мастакі скончылі мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута і ўжо больш за 40 гадоў ідуць поруч і ў прафесіі, і ў творчасці, і па

жыцці. Майстра эстампа, малых формаў графікі Генадзя і майстрыху ручнога мастацкага ткацтва і выцінанкі Святлану аб'ядноўвае і тое, што абодва прысвяцілі жыццё навучанню юных берасцейцаў асновам выяўленчага мастацтва. У экспазіцыі прадстаўлены экслібрысы і графіка, выцінанкі і габелены. Кожны твор – асобная старонка агульнай карункавай гісторыі брэсцкіх мастакоў. Мастацтва экслібрыса і выцінанкі імкнецца захоўваць старажытныя традыцыі, спалучаць іх з сучаснымі аўтарскімі вынаходкамі. Выразная, адметная манера Генадзя Вяля робіць прадстаўленыя на выставе сюжэтныя экслібрысы пазнавальнымі. А сатканыя сюжэты, папяровы сусвет выцінанкі Святланы Вяль уражваюць чароўным спляценнем фантазій, глыбокай сімвалічнасцю. Кветкі, птушкі, анёлы поўняцца лірычным настроем, цеплынёй, яскравасцю фарбаў і акцэнтаў. «Карункавая гісторыя» – шматстаронкавы аповед аб шчырым захапленні культурай і літаратурай, аб аматарах чытання, кніжных знакаў і ўладальніках бібліятэк, аб нацыянальных беларускіх вобразах, традыцыях і традыцыйных рамёствах, сяброўстве, каханні, веры і надзеі.

Выстава будзе працаваць да 15 лістапада.